**У.П.Угольнік,** *заг. кафедры мастацтва эстрады БДУ культуры*
**В.П.Раінчык,** *прафесар*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНЫХ ЯКАСЦЕЙ БУДУЧЫХ ЭСТРАДНЫХ ВЫКАНАЎЦАЎ У ПРАЦЭСЕ СУМЕСНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КАФЕДРЫ МАСТАЦТВА ЭСТРАДЫ І МАЛАДЗЁЖНАГА ТЭАТРА ЭСТРАДЫ

Працэс падрыхтоўкі студэнтаў, будучых эстрадных выканаўцаў, складаецца з некалькіх узаемазвязаных этапаў:

– адбор з ліку абітурыентаў юнакоў і дзяўчат, якія маюць здольнасці ў адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй, прывабныя знешнія даныя, здольнасці пластычна рухацца і, самае галоўнае, здольнасці да навучання;

– арганізацыя вучэбнага працэсу, накіраванага на стварэнне канцэртнага нумару кожным студэнтам або групай студэнтаў у канцы семестраў на працягу ўсяго тэрміну навучання, пачынаючы з першага курса;

– пастаянная сцэнічная практыка ўсіх студэнтаў на розных канцэртных пляцоўках, удзел у фестывалях і конкурсах для набыцця практычнага вопыту публічных выступленняў;

– назапашванне ўласнага рэпертуару для пачатку самастойнай канцэртнай дзейнасці пасля заканчэння універсітэта.

Умовамі для здзяйснення гэтага працэсу з'яўляюцца, папершае, адпаведнае нарматыўнае і вучэбна-метадычнае забеспячэнне (кваліфікацыйная характарыстыка, вучэбны план, вучэбныя праграмы, праграмы вытворчай, педагагічнай і выканальніцкай практыкі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, рэпертуарныя зборнікі і інш.); па-другое, укамплектаванасць кафедры высокакваліфікаванымі педагагічнымі кадрамі, якія маюць уласны практычны вопыт канцэртнай дзейнасці на прафесійнай сцэне; па-трэцяе, аб'яднанне намаганняў выкладчыкаў розных спецыяльных дысцыплін для стварэння канцэртных нумароў (маюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на ўвазе рэжысура нумара, вакал, фанаграма або жывое гучанне ансамбля, сцэнічная пластыка, касцюм, макіяж, мастацкі вобраз), а таксама дзейнасць выкладчыкаў усіх спецыялізацый (інструментальная музыка, эстрадныя спевы, размоўны жанр, арыгінальны жанр і рэжысура эстрады) як адзінага творчага арганізма з мэтай стварэння сумесных цэласных канцэртных праграм кафедры.

Разгледзім кожны з этапаў падрыхтоўкі эстрадных выканаўцаў.

Добра прадуманыя сістэма і змест уступных экзаменаў, якія праходзяць у два туры і прадугледжваюць ацэнку як тэхнічнага ўзроўню абітурыентаў у адпаведнай галіне мастацтва, так і ўзроўню тэарэтычнага і інтэлектуальнага, разам з тым маюць некаторыя недахопы. Гэта тычыцца перш за ўсё адбору будучых студэнтаў на спецыялізацыю «эстрадныя спевы», на ўступных экзаменах па якой не прадугледжаны экзамен па пластыцы або харэаграфіі. Як вынік, далёка не ўсе студэнты могуць добра рухацца пры выкананні песні, што не дазваляе стварыць яркі, арганічны сцэнічны вобраз, а стварэнне менавіта такога вобраза з'яўляецца мэтай выканання.

Кафедра мастацтва эстрады рыхтуе таксама спецыялістаў у галіне культуры для работы ў прафесійных эстрадных калектывах, установах культуры ў якасці выкладчыка. Адным з найважнейшых напрамкаў у рабоце з'яўляецца канцэртная дзейнасць студэнтаў. У спалучэнні з навучальным працэсам канцэртная дзейнасць спрыяе найбольш якаснай падрыхтоўцы прафесійных выканаўцаў у галіне мастацтва эстрады. Кафедра праводзіць шэраг канцэртаў і выступленняў як у межах універсітэта, так і ў рэспубліцы. Студэнты кафедры прымаюць актыўны ўдзел у канцэртнай дзейнасці, у конкурсах і фестывалях.

Вынікі канцэртнай дзейнасці, яе аналіз праводзяцца на пасяджэннях кафедры. Аналізуецца вопыт праведзенай работы і шукаюцца шляхі яе ўдасканалення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З улікам патрабаванняў да канцэртнай дзейнасці ў навучальным працэсе створана наступная структура падрыхтоўкі да яе:

– размеркаванне студэнтаў па творчых калектывах (салісты, удзельнікі ансамбляў, удзельнікі аркестраў);

– падбор рэпертуару;

– рэпетыцыйны перыяд;

– прагляды праграм і нумароў;

– перыяд "накатвання" праграм і нумароў (аналіз недахопаў і іх выпраўленне, пошук дадатковых сродкаў мастацкай выразнасці);

– выпрацоўка навыкаў самастойнага стварэння канцэртных нумароў і праграм.

У падрыхтоўцы студэнтаў да канцэртнай дзейнасці важным момантам з'яўляецца стварэнне духу спаборніцтва. Гэтаму спрыяюць правядзенне конкурсаў унутры кафедры, а таксама ўдзел студэнтаў у разнастайных конкурсах і фестывалях, якія адбываюцца ў рэспубліцы.

Вопыт правядзення канцэртных мерапрыемстваў выяўляе не толькі станоўчыя моманты, але і недахопы. У падрыхтоўцы вакалістаў трэба звярнуць увагу на тое, што яны слаба ці зусім не валодаюць такімі навыкамі, як сцэнічны рух, майстэрства акцёра. Эстрадны вакальны нумар – гэта не толькі спевы. Тут важныя вакал, сцэнічны рух, майстэрства акцёра, афармленне сцэны, візаж, рэжысура.

Пры праглядзе вакалістаў на сцэне, як правіла, выяўляецца, што прафесійна зроблены толькі вакал, а гэта толькі адзін з кампанентаў эстраднага нумара. Мэтазгодна перагледзець вучэбныя праграмы па майтэрстве акцёра, сцэнічным руху, сцэнічнай мове, рэжысуре эстрады і падпарадкаваць іх змест спецыфіцы стварэння эстраднага вакальнага нумара.

Станоўча ўплываюць на падрыхтоўку студэнтаў да канцэртнай дзейнасці іх выступленні сумесна з выкладчыкамі кафедры.

Пасля канцэртаў праводзіцца іх аналіз студэнтамі класа, удзельнікамі канцэрта і студэнтамі кафедры, якія на ім пры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сутнічалі. Такія абмеркаванні спрыяюць перадачы вопыту выкладчыкаў сваім навучэнцам.

Аналіз дзейнасці выпускнікоў кафедры Дарафеевай І.А. (салістка-вакалістка, лаўрэат фестывалю «Славянскі базар»); Грыбалёвай Л.У. (салістка-вакалістка); Пузевіча С.В. (заснавальнік групы «Новыя джазеры», бас-гітара); Салаўёва А.М. (гітара, ансамбль «Беларускія песняры»); Герашчанкі Ю.В. (аркестр МУС, ф-на, і ансамбль «Новыя джазеры»); Зайцава А.П. (бас-гітара, Дзяржаўны канцэртны аркестр РБ); Мікалайчанкі С.У. (гітара, Магілёўская філармонія); Церабеж А.А. (саксафон, аркестр МУС і ансамбль «Новыя джазеры») дазваляе лічыць правільным падыход кафедры да падрыхтоўкі студэнтаў да канцэртнай дзейнасці.

Наяўнасць прафесійнай канцэртнай сцэны ў навучальнай установе станоўча ўплывае на падрыхтоўку кадраў эстрады. Адначасова гэта патрабуе значнага клопату і адказнасці. Неабходныя, з аднаго боку, арганізаванасць, прафесіяналізм, а з другога – вытрымка, цярплівасць і пошук нестандартных падыходаў, практычных напрацовак.

Супрацоўніцтва дзвюх устаноў ідзе па напрамках канцэртнай, гастрольнай і вучэбнай дзейнасці. Не ўсе з гэтых напрамкаў развіваюцца аднолькава актыўна. Перавага належыць канцэртнай дзейнасці.

У падрыхтоўцы студэнтаў да канцэртаў у тэатры эстрады выявіўся шэраг станоўчых момантаў – большая колькасць з іх была падрыхтавана да напружанай работы на адпаведным узроўні. Але выявіліся і недахопы. Напрыклад, выканаўцы на струнных інструментах не ў дастатковай меры валодаюць джазавым і эстрадным стылем выканання. У некаторай ступені гэта абумоўлена тым, што мала адпаведнай нотнай літаратуры. Выйсце з гэтага становішча можа быць знойдзена ў забеспячэнні неабходнай нотнай літаратурай, а таксама ў перакладзе твораў, напісаных для іншых інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У час работы з аркестрам выявілася, што пэўны эфект прыносяць заняткі па групах з выкладчыкамі, вывучэнне аркестравых партый, авалодванне тэхнічнымі прыёмамі на занятках па спецыяльнасці. На агульных рэпетыцыях аркестра перыядычна павінны прысутнічаць выкладчыкі, якія кантралююць наведванне і работу студэнтаў у аркестры.

Адной з праблем з'яўляецца недахоп аркестравых партытур. Мэтазгодна спалучэнне спецыялістаў камп'ютэрнай аранжыроўкі з работай эстраднага аркестра. Першапачатковы варыянт п'есы ці акампанементу ствараецца студэнтамі гэтай спецыяльнасці пад кантролем выкладчыка. Канчатковае звядзенне найбольш удалых аранжыровак робіцца на студыйным камп'ютэры Маладзёжнага тэатра эстрады.

Некалькі калектываў і кіраўнікоў – выкладчыкаў факультэта мастацкай творчасці БДУ культуры супрацоўнічаюць з тэатрам на пастаяннай аснове. Гэта эстрадна-сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Віктара Валатковіча, харэаграфічныя майстэрні Аляксандра Міхайлавіча і Людмілы Паўлаўны Яфрэмавых і інш.

І ўсё ж нягледзячы на гэтыя абставіны, трэба адзначыць гатоўнасць кіраўніцтва тэатра крочыць насустрач, абмяркоўваць і вырашаць спрэчныя пытанні. Сумесная дзейнасць кафедры мастацтва эстрады і ў цэлым факультэта мастацкай творчасці БДУ культуры і Маладзёжнага тэатра эстрады спрыяе ўдасканаленню прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў – будучых эстрадных выканаўцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ